адначасова атрымліваць навыкі, так бы мовіць, мірнага суіснаваньня, урокі таго, як жыць у згодзе і паразуменьні адно з адным.

Што датычыць *пляцоўкі будаўнічай*, то незалежна ад яе памераў і тапаграфіі, тут усё вырашае адзін чыньнік — хтó будоўлю заказвае, хтó праектуе, ну, і, вядома ж, хтó прараб — вольны будаўнік ці раб. У першым выпадку будзе ўзьведзены трывалы ды дыхтоўны дом. У другім — пабудаваная з горам напалам якая-небудзь хаціна-камуналка, якая пры першым жа землятрусе дасьць трэшчыны або разваліцца зусім.

*Пляцоўка стартавая* і *ўзьлётная, пляцоўка пасадачная.* Яны часта не супадаюць, не атаясамліваюцца, што і меў на ўвазе народ, калі казаў: высока падляцеў, ды нізка сеў; прыехаў тузам, а паехаў з канфузам; няпраўдай можна далёка пайсьці і ўвесь сьвет абысьці, а назад, дадому зь ёй ня вернешся.

# Постаць

***Леанід Галубовіч***

Яшчэ зь вясковага дзяцінства помню — зіма, шарая гадзіна, а ты адзін у хаце, замкнуты знадворку, бездапаможны, галодны, сплаканы. Усё ўзіраешся ў сутоннае акно, і, вой, як ёкае тваё дзіцячае сэрца, калі раптам за шыбаю прамільгне знаёмая *постаць* маці або бацькі. Гэта і ёсьць твае найпершыя *постаці*...

Па часе давядуць яны табе, што ўсякае жыцьцё даецца з боскай ласкі. І ўжо Бог стане той тваёй патаемнай *постацьцю*, якая жыцьме ў табе толькі за кошт веры. І будзе велічнай нагэтулькі, наколькі моцнай будзе гэтая вера.

За згаданымі трыма зьявяцца *постаці* тваіх школьных настаўнікаў, якія ў сваю чаргу адкрыюць табе *постаці* слынных людзей навукі, культуры й гісторыі. Сярод іх будзе шмат чужых і часовых імёнаў. Такіх, як Іван Жахлівы, Сувораў, Маркс і Энгельс, Ленін і Сталін, Дзяржынскі...

І ўсё ж паступова, як з туману, пачнуць выяўляцца й свае, пасоўваючы чужых наўзбоч памяці. Так увойдуць у тваё жыцьцё Францішак Скарына, Мікола Гусоўскі, Кастусь Каліноўскі, Францішак Багушэвіч, Максім Багдановіч, Ларыса Геніюш, Уладзімер Караткевіч.

Больш за 40 гадоў мінула з той шарай зімовай гадзіны... І цяжка паверыць, што пішу я гэтыя словы ў Менску, у сваёй кватэры на вуліцы Кастуся Каліноўскага, што ў мяне ёсьць дачка-пяцікляснiца, зь якой можна своеасабліва пакалямбурыць наконт яе ўзаемаадносінаў з падлеткамі:

— Каго любіш? — пытаюся.

— Люблю Беларусь! — не міргнуўшы вокам, какетліва вольнічае яна.

— Тады ўзаемна, — кажу я не без іроніі, але з падтэкстам.

Так, спакваля, у чалавечым жыцьці паўстае і самая важная *постаць* — Айчыны.

# Прамень

***Сяржук Сокалаў-Воюш***

Слова *прамень* Вацлаў Ластоўскі памылкова выводзіць ад слова *прамы* і падае цэлы шэраг вытворных — *праменны*, *прамянее*, *прамяністы*, *прамяністасьць*, *праменьчык*...